## *Падсекцыя 4*

УДК [745/749:069.51]БГУКИ

***Т. І. Васюк,*** *дацэнт,*
*дацэнт кафедры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва*
*ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*культуры і мастацтваў», Рэспубліка Беларусь*

# ЭКСПАЗІЦЫЯ «ТРАДЫЦЫЙНЫЯ РАМЁСТВЫ БЕЛАРУСАЎ»

**Анатацыя.** Артыкул прысвечаны дзейнасці навукова-творчай лабараторыі «Традыцыйныя рамёствы беларусаў», створанай на базе Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў па рашэнні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Галоўныя мэты дадзенай лабараторыі – вывучэнне і даследаванне традыцыйных узораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларусі і іх рэтрансляцыя ў сучаснае мастацтва праз укараненне ў вучэбны працэс вышэйшай школы.

На ўзроўні праграмы навукова-творчай лабараторыі «Традыцыйныя рамёствы беларусаў» былі адноўлены, рэстаўраваны і рэканструяваны старажытныя тэхнікі і тэхналогіі мастацкага ручнога ткацтва, саломапляцення, ганчарства і інш., а лепшыя распрацоўкі ўключаны ў вучэбны працэс кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Па выніках работы навукова-творчай лабараторыі на базе ўстановы створана музейная экспазіцыя «Традыцыйныя рамёствы беларусаў». Дадзеная экспазіцыя ўключае ў сябе творы мастацкай керамікі і традыцыйнага ганчарства, дэкаратыўную пластыку, аўтарскія касцюмы, дэкаратыўныя пано, саламяныя аклады для абразоў і «царскую браму», габелены і тэкстыльныя тканыя кампазіцыі, якія выканалі навуковыя супрацоўнікі лабараторыі разам са студэнтамі кафедры.

**Ключавыя словы:** традыцыйныя рамёствы беларусаў, гісторыя дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, творчасць народных майстроў Беларусі, навукова-творчая лабараторыя, рэтрансляцыя традыцыйных узораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, фонды рэгіянальных музеяў, экспазіцыя твораў сучаснага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

***T. Vasyuk,***
*Associate Professor, Associate Professor of the Department of decorative and applied arts of the Educational Institution «Belarusian State University of Culture and Arts», Republic of Belarus*

# EXHIBITION «THE TRADITIONAL CRAFTS OF BELARUSIANS»

**Abstract.** The article is dedicated to the scientific and creative laboratory «The traditional Crafts of Belarusians», created on the basis of «The Belarusian State University of Culture and Arts» by the decision of the President of the Republic of Belarus. The main purpose of this laboratory is to study and research traditional samples of arts and crafts of Belarus and their retransmission into modern art through the introduction of higher education in the educational process. At the level of the program of the scientific and creative laboratory «The traditional crafts of Belarusians» ancient techniques and technologies of artistic hand weaving, straw weaving, pottery, etc, were restored, restored and reconstructed, and the best developments were included in the educational process of the Department of Folk Arts and Crafts of «The Belarusian State University of Culture and Arts».

As a result of the work of the scientific and creative laboratory on the basis of the university a museum exposition «The traditional crafts of Belarusians» was created. This exposition includes: works of art ceramics and traditional pottery, decorative plastics, author's costumes, decorative panels, straw salaries for icons, straw «royal gate, tapestries and textile woven compositions, which were created by scientists of the laboratory arts and crafts.

**Keywords:** the traditional crafts of Belarusians, the history of arts and crafts, works of folk artists of Belarus, the scientific and creative laboratory, retransmission of traditional samples of arts and crafts, the funds of regional museums, the exposition of works of modern arts and crafts.

«Традыцыйныя рамёствы беларусаў» – такую назву мела навукова-творчая лабараторыя, якая была створана па рашэнні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у 2002 г. на базе кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога (далей – НДПМ) мастацтва Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў (далей – БДУКМ). Кіраўніком лабараторыі нязменна заставаўся прафесар, доктар мастацтвазнаўства Р. Ф. Шаура, навуковымі супрацоўнікамі з’яўляліся выкладчыкі кафедры, мастакі-практыкі і навукоўцы. Вялікая колькасць даследаваных тэм была ўкаранена ў навуковы працэс не толькі кафедры НДПМ БДУКМ, але і розных устаноў.

Вывучэнне гісторыі беларускай керамікі і іншых відаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў рамках вучэбнага працэсу вышэйшай мастацкай школы не праводзілася па пашыранай

праграме навучання. Таму неабходна было наведаць і вывучыць багацейшыя фонды беларускіх рэгіянальных музеяў і дамоў творчасці, а таксама даследаваць персанальную творчасць мастакоў-керамістаў і народных майстроў Беларусі.

Традыцыі ў ганчарстве, ткацтве і пляценні з саломы і лазы вывучаліся асабліва дасканала. Мастацкае рамяство беларусаў мае цікавыя асаблівасці развіцця ў пэўны гістарычны перыяд. Увага навукоўцаў і мастакоў была накіравана ў асноўным на пасляваенны перыяд XX ст.

Мастацтва керамікі з’яўляецца адным з найбольш старажытных відаў творчасці. На тэрыторыі Беларусі не захаваліся наскальныя малюнкі, а чарапкі сасудаў часоў эпохі неаліту знойдзены ў значнай колькасці. Энцыклапедычнае выданне «Археалогія Беларусі» сістэматызуе навуковыя матэрыялы даследаванняў археолагаў. Тэрыторыя сучаснай Беларусі падзяляецца на некалькі археалагічных культур, якія адрозніваюцца адна ад адной абрысам формы і характарам дэкору. Напачатку гэта былі вастрадонныя сасуды, затым акруглыя і пласкадонныя вырабы, злепленыя з гліны, якая мае асаблівы састаў: з дамешкамі каменчыкаў, травы, лісця. Рыскі, насечкі, штрыхі, наколкі ўтваралі рытмічныя ўзоры на паверхні сасудаў. Знакавае пісьмо мела не толькі эстэтычнае значэнне, яно тэхналагічна рабіла гаршчок больш трывалым пры абпале на адкрытым паветры ў земляной ямцы. Адзначым, што асаблівая мастацкая і тэхналагічная якасць гаршка, абпаленага дровамі на кастры ці ў горне, зацікавіла мастакоў XXI ст. Трэба дадаць, што ў Беларусі з 2002 г. праводзіцца міжнародны пленэр па кераміцы «Арт-Жыжаль». У ім удзельнічаюць мастакі-керамісты многіх краін свету: Расіі, Ізраіля, Венесуэлы, Балгарыі, Польшчы, Літвы і інш.

Па выніках работы навукова-творчай лабараторыі на базе БДУКМ створана музейная экспазіцыя «Традыцыйныя рамёствы беларусаў».

У першапачатковым яе варыянце былі змешчаны копіі і ўзоры рэканструкцыі традыцыйнай беларускай керамікі, выкананыя ў адпаведнай тэхналагічнай мастацкай апрацоўцы гліны: у задымленні, абвары, васкаванні і глянцаванні і інш. Але неабходна адзначыць, што экспазіцыя складаецца не толькі з вырабаў з гліны, аўтарскіх кампазіцый і рэтрансляцый лепшых

традыцыйных узораў. У спіс традыцыйных мастацкіх рамёстваў Беларусі ўваходзяць ткацтва і саломапляценне.

На ўзроўні праграмы нашай навукова-творчай лабараторыі адноўлены, рэстаўраваны і рэканструяваны старажытныя тэхнікі і тэхналогіі мастацкага ручнога ткацтва, лепшыя распрацоўкі якога былі ўключаны ў вучэбны працэс кафедры НДПМ.

Важна адзначыць навуковы і практычны вопыт дацэнта А. І. Непачаловіч і выкладчыка кафедры Н. А. Валынец – мастакоў-тэкстыльшчыкаў высокага прафесійнага ўзроўню, якія з поспехам распрацавалі частку экспазіцыі, прысвечаную тэкстылю, у яе ўвайшлі працы многіх лаўрэатаў спецыяльнага фонду Прэзідэнта па падтрымцы таленавітай моладзі, аўтарскія касцюмы, дэкаратыўныя пано, габелены і тэкстыльныя тканыя кампазіцыі. Дадзеныя ўзоры мастацтва былі створаны навуковымі супрацоўнікамі лабараторыі разам са студэнтамі кафедры НДПМ. Такім чынам, адбылося мастацкае, тэхналагічнае і тэхнічнае ўкараненне ў вучэбны працэс забытых прыёмаў ткацтва і аздаблення тканін, што істотна ўзбагаціла вучэбны працэс установы.

Лепшыя творы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва кафедры дэманстраваліся на многіх выстаўках краіны і па-за яе межамі. Навуковыя супрацоўнікі пад кіраўніцтвам прафесара Р. Ф. Шауры правялі мноства канферэнцый на розных узроўнях па пытаннях сучаснага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва: у Варшаве, Каўнасе, Вілейцы; у в. Гарадная, Гайнаўка; мінскім НЦСМ, Музеі беларускага народнага мастацтва ў Раўбічах і інш.

Трэцім «брэндам» мастацкай культуры навукова-творчай лабараторыі беларусаў пасля керамікі і тэкстылю з’яўляецца саломапляценне. Гэты значны пласт нацыянальнай мастацкай культуры прадстаўлены дэкаратыўнымі пано з інкрустацыяй з саламяных элементаў, саламяным акладам для абразоў, «царскай брамай» і іншымі экспанатамі ў аўтарскім выкананні студэнтаў кафедры НДПМ.

Экспазіцыя «Традыцыйныя рамёствы беларусаў» прызначалася гледачам дзеля знаёмства з нацыянальнымі традыцыямі ў мастацтве. Адзначым, што адметнай рысай народнай творчасці беларусаў з’яўляецца высокамастацкае адзінства. У кожнага экспаната ёсць свая гісторыя: ці то копія, ці рэканструкцыя, ці аўтарскі твор, які выкананы ў традыцыйнай тэхніцы з пера-

канаўчымі мастацкімі вобразамі. Экспазіцыя мела ўстойлівы дэвіз – «Традыцыя і сучаснасць», які мяркуе выкарыстанне і развіццё на сучасным узроўні традыцыйных тэхналогій, прыёмаў і спосабаў працы, зыходзячы з вопыту айчыннай тэхналогіі апрацоўкі прыродных матэрыялаў. Актуальная візуальная інфармацыя прадстаўляла гледачу звесткі па гісторыі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, а сучасная імправізацыя з трывалымі і ўстойлівымі традыцыямі надавала экспазіцыі асаблівую энергетыку.

УДК 645.5(44):347.78.025

***А. Г. Міцкевіч,***
*кандыдат біялагічных навук, дацэнт кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», вядучы навуковы супрацоўнік дзяржаўнай установы «Навукова-практычны цэнтр Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз Рэспублікі Беларусь»;*

***І. М. Скварцова,***
*кандыдат мастацтвазнаўства, загадчык аддзела выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва дзяржаўнай навуковай установы «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі»;*

***Е. У. Сенькевіч,***
*старшы навуковы супрацоўнік дзяржаўнай установы «Навукова-практычны цэнтр Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз Рэспублікі Беларусь»;*

***Н. В. Шаркова,***
*магістр мастацтвазнаўства, малодшы навуковы супрацоўнік дзяржаўнай установы «Навукова-практычны цэнтр Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз Рэспублікі Беларусь», Рэспубліка Беларусь*

# АТРЫБУЦЫЯ ФАРФОРАВАЙ ВАЗЫ ВЫТВОРЧАСЦІ ЛІМОЖСКАЙ МАНУФАКТУРЫ ЖАНА ПУЯ (ФРАНЦЫЯ)

**Анатацыя.** Артыкул падрыхтаваны па выніках мастацтвазнаўчай атрыбуцыі фарфоравай вазы з прыватнага збору, у ходзе якой было